# Высокая мода ёсць і ў кнізе

---

**Гран-пры 56-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» атрымала факсімільнае выданне «Кніжная спадчына Францыска Скарыны»**

**У кнізе важны не толькі змест, але і ілюстрацыі, дызайн, паліграфічнае выкананне, арыгінальнае (ці наадварот, традыцыйнае) мастацкае рашэнне. Тое, як выглядае выданне, у многім вызначае, ці будзе яно прываблiваць увагу чытача, ці знойдзе сваё месца на паліцы любімых кніг.**

---



Айчынная выдавецкая галіна і ў краіне, і ў міжнароднай супольнасці традыцыйна адзначаецца за захаванне высокай культуры кнігі. Таму і Нацыянальны конкурс «Мастацтва кнігі», што ў нашай краіне прайшоў вось ужо 56-ы раз, засведчыў: беларусы шануюць кнігу, чытанне, нашы нацыянальныя каштоўнасці, якія знайшлі ўвасабленне ў літаратуры. Так, учора на цэнтральнай пляцоўцы Нацыянальнага стэнда Рэспублікі Беларусь былі ўганараваныя 38 самых адметных кніг, а таксама мастакі і дызайнеры, якія прадставілі самыя прыгожыя выданні. Урачыстая цырымонія прайшла падчас XXIV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.

Создано демо-версией Универсального Конвертера Документов. Полная версия не добавляет этот штамп.
WWW.PRINT-DRIVER.RU

Сімвалічна, што конкурс «Мастацтва кнігі» сёлета быў асветлены зоркай Францыска Скарыны. Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання тут прадстаўленая намінацыя «Першадрук». Яе пераможцам стала кніга Анатоля Цітова **«Шляхамі Францыска Скарыны»**, што пабачыла свет у выдавецтве «Народная асвета». У гэтай жа намінацыі адзначаныя адразу два праекты «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі». Так, дыплом І ступені атрымала **трохтомная дзіцячая энцыклапедыя пра першадрукара**, падрыхтаваная намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, кандыдатам культуралогіі Алесем Сушам, а спецыяльны дыплом прысуджаны кнізе **«Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку»**. Не застаўся без увагі і праект выдавецтва «Мастацкая літаратура» **«Францыск Скарына. Са слаўнага горада Полацка»** — ён атрымаў дыплом ІІ ступені.

Тэма 500-годдзя беларускага кнігадрукавання прагучала і ў намінацыі «Садружнасць», дзе адзначаюцца найлепшыя сумесныя выдавецкія праекты ў межах СНД. Тут пераможцам стала кніга Алеся Сушы **«Францыск Скарына — чалавек свету»**.

Заўважыла кампетэнтнае журы і кнігі, што пабачылі свет у Выдавецкім доме «Звязда». Дыплом І ступені ў намінацыі «Літ-фармат», дзе адзначаюцца найпрыгажэйшыя літаратурна-мастацкія выданні, атрымала кніга Міколы Мятліцкага **«Скарб бяздонны»**, а ў намінацыі «Арт-кніга» — за найлепшы выдавецкі праект па мастацтве — дыплом ІІ ступені прысуджаны альбому **«Рукою майстра. Творчасць мастакоў Міншчыны»**.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

Создано демо-версией Универсального Конвертера Документов. Полная версия не добавляет этот штамп.
WWW.PRINT-DRIVER.RU